и призыв соблюдать международные обязательства, касающиеся права на убежище [6].

Проанализировав переход Литвы к демократии в соответствии с моделью Д. Растоу, мы видим, что страна не до конца прошла все вышеупомянутые в данной теории фазы. Несмотря на то, что, первые три условия перехода к демократии имеются (чувство национального единства, наличие устойчивого и серьезного конфликта в обществе, приход к сознательному выбору демократических процедур), литовские политики на данный момент так и не сумели привыкнуть к новому демократическому порядку и нередко обвиняются в нарушении прав человека.

**Литература**


1. 25 лет независимости государств Балтии: из Советского в Европейский Союз [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://mgimo.ru/upload/iblock/858/elibrary_28352625_14778726.pdf. — Дата доступа: 30.10.2021.
2. 30 лет назад Литва вышла из СССР [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://lenta.ru/articles/2020/03/11/litva. — Дата доступа: 30.10.2021.
3. Вильнюс обвиняется в нарушении прав человека [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://baltnews.lt/vilnius_news/20181210/1018661924/Lithuania-prava-chelovek-naruscheniya.html. — Дата доступа: 31.10.2021.
4. Растоу, Д. А. Переходы к демократии: попытка динамической модели / Д. А. Растоу [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://read.virmk.ru/R/Rastou.htm. — Дата доступа: 25.10.2021.
5. Операция в Вильнюсе и опрос: как Литва покидала СССР [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://www.gazeta.ru/science/2021/02/08_a_13471946.shtml. — Дата доступа: 31.10.2021.
6. ООН призвало Литву соблюдать международные обязательства, касающиеся права на убежище [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://www.belta.by/world/view/v-oon-prizvali-litvu-sobljudat-mezhdunarodnye-objazatelstva-kasajuschiesja-prava-na-ubezhische-453882-2021. — Дата доступа: 25.10.2021.


# Традыцыя гасціннасці беларускай шляхты ў першай палове XIX ст.


*Пухцеева Л. С., студ. IV к. БДУ,*
*навук. кір. Макарэвіч В. С., канд. гіст. навук, дац.*


У ментальнасці беларускага дваранства важнае месца займала супольнасць. Блізкасць прадстаўнікоў саслоўя рэалізавалася пераважна праз узаемныя візіты ў госці да сваякоў, сяброў і суседзяў у іх сядзібы. Адсюль і з’яўленне такой шляхецкай традыцыі, як гасціннасць.

Шляхецкая гасціннасць з'яўлялася дэманстрацыяй асабістага багацця і пышнасці роду [1, с. 64]. Звычай гасціннасці дазваляў мясцовым элітарным групам падтрымліваць высокі ўзровень камунікацыі. Мэтамі гасціннасці маглі быць матрыманіяльныя разлікі, палітычныя мэты, неабходнасць падтрымкі сацыяльнага прэстыжу (напрыклад, Антон і Людвіка Горваты былі гасціннымі гаспадарамі і, як патрабавалі традыцыя і губернскае дваранства ад сваіх высокапастаўленых дваранскіх выбранцаў, заўсёды трымалі свой дом у Мінску і загарадную сядзібу Прылукі (пад Мінскам) адкрытымі для дваран [2, с. 60]), а таксама ўсталяванне сваяцкіх унутрысаслоўных сувязяў.

Для суседскіх наведванняў не патрабавалася важкай нагоды. Ухіленне ад супольных таварыскіх сустрэч выклікала асуджэнне [1, с. 64].

Лічылася цалкам нармальным прыехаць у госці і затрымацца там на некалькі дзён ці нават тыдняў. Так, напрыклад, А. Пакаш адзначала ў сваіх мемуарах, што яны з сям'ёй прыехалі на імяніны дзядулі, «пасля якіх яшчэ з пару тыдняў гасцявалі ў Юстыніянаве» [3, с. 356]. Таксама сямейныя, сяброўскія і суседскія наведванні шляхты згадвае ў сваіх успамінах А. Адынец, пры гэтым адзначаючы, што такія візіты маглі цягнуцца тыднямі [4, с. 303–305].

Часам гасціннасць шляхты выходзіла за рамкі разумнага. Напрыклад, адзін пан ва ўспамінах Тышкевіча быў настолькі гасцінным, што мог выкруціць колы ў павозцы сваіх гасцей, каб тыя затрымаліся ў яго. Прычым затрымліваў ён гасцей нават тады, калі пакояў ім не хапала, паколькі лічыў, што добрае сэрца ўсё для іх замяніць. У выніку госці спалі ў зале каля вялікага старадаўняга гадзінніка, які кожныя чвэрць гадзіны адбіваў час; каля распаленай печы і г.д. [5, с. 13].

Пэўнай праявай гасціннасці стаў інстытут рэзідэнцтва. Гэта, па сутнасці, былі нахлебнікі высакароднага паходжання, якія маглі жыць у маёнтку на забеспячэнні гаспадара гадамі. Для буйных паноў шматлікія рэзідэнты з'яўляліся своеасаблівым палітычным рэсурсам. Для паноў сярэдняй рукі наяўнасць рэзідэнтаў была справай прэстыжу, а таксама крыніцай адносна кваліфікаванага персаналу [1, с. 65]. Традыцыі філантрапічнай дзейнасці з'яўляліся звычайнай праявай «добрага тону» ў шляхецкім асяроддзі і ўказвалі на высокі сацыяльны статус дабрадзея [6, с. 145].

Рэзідэнты згадваюцца ў шматлікіх мемуарах. Так, напрыклад, Ганна Герыч успамінае, што заўсёды з імі жыло некалькі чалавек, якія не належалі да іх сям'і, а з'яўляліся рэзідэнтамі. Апісваючы адну рэзідэнтку, Герыч адзначае, што яе любілі і дапамагалі ва ўсім, у чым толькі было магчыма, бо той пасаг, які ў яе быў, яна ўжо праела [7, с. 15]. Пакаш піша, што ў Юстыніянаве стол быў добры, бо там заўсёды знаходзілася шмат дамачадцаў і рэзідэнтаў, якія гасцявалі там так зручна, нібыта ў сябе дома, лічачы Юстыніянаў уласным домам [3, с. 357]. «Усіх ён (дзядуля) абдымаў аднолькава: і свайго пляменніка,

багацея Шадурскага, і старых рэзідэнтаў, якія ўсё жыццё харчаваліся ягоным хлебам, не ведаючы іншай службы, акрамя ружанца» [3, с. 355].

Такім чынам, гасцінная традыцыя і інстытут рэзідэнцтва сфарміраваліся, верагодна, пад уплывам некалькіх фактараў: 1) імкненне наладзіць унутрысаслоўныя сувязі; 2) жаданне падкрэсліць сваё становішча і багацце; 3) філантрапічныя памкненні як праява «добрага тону».


**Літаратура**

1. Шыдлоўскі, С. А. Культура прывілеяванага саслоўя Беларусі першай паловы XIX стагоддзя : дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.07 / С. А. Шыдлоўскі. — Мінск, 2009. — 140 л.
2. Раюк, А. Р. Нефармальныя сувязі паміж дваранствам Мінскай губерні ў 1795–1863 гадах / А. Р. Раюк // Гісторыя і грамадазнаўства : навукова-метадычны часопіс. — Мінск, 2020. — №1. — С. 58–63.
3. Пакаш з Рудамінаў, А. Успаміны (урыўкі) // Гісторыя Беларусі XIX ст. у мемуарах : [зб. арт. / гал. рэд. В. Булгакаў]. — Мінск : Гайсак, 2014. — С. 307–361.
4. Odyniec, A. E. Wspomnienia z przeszłości opowiadane Deotymie / A. E. Odyniec. — Warszawa : Nakład Gebethnera i Wolffa, 1884. — 459 s.
5. Tyszkiewicz, E. Obrazy domowego pożycia na Litwie [Электронны рэсурс] / E. Tyszkiewicz. — Рэжым доступу: https://kpbc.umk.pl/dlibra/publication/73422/edition/79792/content. — Дата доступу: 04.11.2021.
6. Куль-Сяльверстава, С. Я. Беларусь на мяжы стагоддзяў і культур : Фармаванне культуры Новага часу на беларускіх землях (другая палова XVIII ст. — 1820-я гг.) / С. Я. Куль-Сяльверстава. — Мінск : БДУ, 2000. — 259 с.
7. Гарбачова, В. Ганна Герыч пра Рэйтанаў, Радзівілаў і Ішкалдзь [Электронны рэсурс] / В. Гарбачова. — Рэжым доступу: https://elib.bsu.by/bitstream/123456789/89744/1/Arche_№%2012.%202011.pdf. — Дата доступу: 11.11.2021.


# Пенсионная реформа В. Ристера в ФРГ


*Саватеева Д. В., асп. БГУ,*
*науч. рук. Шупляк П. А., канд. фил. наук, проф.*


Одной из важнейших составляющих социальной политики любого развитого государства является пенсионное обеспечение. За последние десятилетия система, которая складывалась на протяжении ста лет, столкнулась с рядом проблем, связанных с демографическими процессами. Происходит постепенное увеличение количества пожилых людей среди общей доли населения страны. На сегодняшний день количество лиц, получающих пенсионные выплаты, достигает около 25% от общей численности населения [1].